# ПРЭС-РЭЛІЗ

***Кожны год** **21 лютага** **ва ўсім свеце пад эгідай ЮНЕСКА адзначаецца** **Міжнародны дзень роднай мовы****, галоўнай мэтай якога з'яўляецца падтрыманне нацыянальных моў і культур, захаванне нацыянальнай адметнасці і самабытнасці, забеспячэнне права кожнага грамадзяніна карыстацца роднай мовай і стварэнне ўмоў для гэтага з боку дзяржаўных органаў улады.***




***У 2021 годзе, вызначаным у нашай краіне як ГОД НАРОДНАГА АДЗІНСТВА, асаблівае значэнне набывае навукова-практычнае забеспячэнне паспяховага функцыянавання беларускай мовы ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, у якіх павінна выкарыстоўвацца дзяржаўная мова краіны і мова тытульнай нацыі. База для гэтага створана ў акадэмічным Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа (цяпер – адзін з філіялаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі), бо менавіта гэтая ўстанова забяспечвае каардынацыю і правядзенне сістэмных даследаванняў у галіне беларускага мовазнаўства.***

***Да Міжнароднага дня роднай мовы філіялам "Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа" запланавана правядзенне шэрага мерапрыемстваў – круглых сталоў, прэзентацый, мерапрыемстваў адукацыйна-забаўляльнага характару.***

## 15 лютага (панядзелак):



**у $14^{30}$** у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі будзе праведзены **круглы стол "Акадэмік Яўхім Карскі – заснавальнік беларускага навуковага мовазнаўства і літаратуразнаўства, этнограф, фалькларыст, палеограф"** (*вул. Сурганава, д. 15*). *Мерапрыемства праводзіцца да 160-годдзя вучонага і 100-годдзя Інбелкульта.*

## 16 лютага (аўторак):




**у $11^{00}$** у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбудзецца **прэзентацыя кнігі "Шкляр Г.З. Выбраныя працы. Моўная спадчына"** (*вул. Сурганава, д. 15*). *Названая кніга – гэта комплекснае выданне, якое ўключае асобныя працы выбітнага мовазнаўцы Г.З.Шкляра, які працаваў у Акадэміі навук Беларускай ССР у 30-я гады XX ст. У кнізе змяшчаюцца звесткі, якія адлюстроўваюць жыццё і навуковую дзейнасць гэтага даследчыка. Асаблівая ўвага надаецца яго працы ў Беларусі ў час станаўлення нацыянальнай навукі.*

**у $14^{30}$** у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі будзе праведзены **круглы стол "Беларуская мова ў кітабах"** (*вул. Сурганава, д. 15*). *Кітабы ствараліся з XVI ст. татарамі, якія пасяліліся ў Вялікім Княстве Літоўскім. Кітабы – шматмоўныя рукапісы, у якіх дамінуе тагачасная беларуская народна-дыялектная мова, пры гэтым напісаныя арабскім пісьмом. У кітабах адлюстраваныя побыт, звычаі, традыцыі татараў-перасяленцаў, таму іх тэксты – каштоўны матэрыял для лінгвістаў, этнографаў, літаратуразнаўцаў, гісторыкаў.*



*а, магчыма, і выбару іх далейшага прафесійнага шляху.*

## 18 лютага (чацвер):




**у 14^30^** у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбудзецца **прэзентацыя электроннага перавыдання класічнай працы Івана Насовіча "Словарь белорусского наречия"** – галоўнай крыніцы слоўнікаў беларускай мовы канца XIX – першай паловы XX ст. (*вул. Сурганава, д. 15*). *Электроннае перавыданне слоўніка ўтрымлівае арыгінальны і асучаснены рэестры, арыгінальны тэкст і дадаткі; дапоўнена матэрыяламі крытычнага, біяграфічнага і бібліяграфічнага характару, забяспечана магчымасцю пошуку па тэксце і па ключавых словах, падабраных да аўтарскіх рускамоўных дэфініцый. Адрасавана мовазнаўцам, гісторыкам, этнографам, фалькларыстам і ўсім, хто цікавіцца беларускім словам.*



## 19 лютага (пятніца):

**у 10^00^** у Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратура НАН Беларусі (*вул. Сурганава, д. 1, корп. 2, пак. 1110–1112*) адбудзецца **прэзентацыя дакументальнага фільма "Гаворкі Беларусі"** пра дыялектныя згрупаванні гаворак беларускай мовы і іх адметныя рысы. *Фільм створаны па сцэнарыі В.А.Шклярыка, старшага навуковага супрацоўніка аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа, пры падтрымцы кампаній А1 і Onliner. Паказы стужкі запланаваны таксама ва ўніверсітэтах Мазыра, Гомеля, Магілёва, Віцебска, Гродна і Брэста,у сталічных БДУ і БДПУ.*



## 22 лютага (панядзелак):

**у 15^00^** у Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратура НАН Беларусі (*вул. Сурганава, д. 1, корп. 2, пак. 302*) будзе праведзены **круглы стол "Стварэнне беларускамоўнай заканадаўчай базы як фактар гарманічнага развіцця грамадства"**. *Удзел у пасяджэнні прымуць супрацоўнікі Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, члены Экспертнага савета па пытаннях перакладу заканадаўчых актаў на беларускую мову, члены Рэспубліканскай тэрміналагічнай камісіі пры НАН Беларусі, спецыялісты філіяла "Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа" Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, выкладчыкі ВНУ. Круглы стол уключаны ў Рэспубліканскі план мерапрыемстваў па правядзенні ў Рэспубліцы Беларусь 2021 года пад знакам Года народнага адзінства.*

